# ПЕРСПЕКТЫВЫ ПАРТНЁРСТВА ЁСЦЬ. І НЕМАЛЫЯ



Фота Эдуарда ПАЛУТАРАВА.

Удзельнікі сустрэчы беларускіх і літоўскіх прадпрымальнікаў у Пасольстве Літоўскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь.

У Пасольстве Літвы ў Беларусі нядаўна адбылася ўжо другая за апошнія два месяцы сустрэча прадпрымальнікаў дзвюх краін, удзел у якой узялі больш за 40 літоўскіх і беларускіх бізнэсменаў. Першая праходзіла ў Вільнюсе ў верасні. Такая інтэнсіўнасць кантактаў сведчыць аб высокай зацікаўленасці дзелавых колаў краін-суседак у развіцці эфектыўнага і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Цікава, што з літоўскага боку гэтыя сустрэчы праходзяць у рамках сумеснага праекта Канфедэрацыі прадпрымальнікаў і працадаўцаў і Міністэрства замежных спраў Літоўскай Рэспублікі, які называецца «Перспектывы гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж прадпрымальнікамі Літвы і Беларусі».

— Мэта гэтага праекта — вызначыць асноўныя магчымасці і перашкоды, якія ўзнікаюць у распаўсюджванні дзелавых сувязяў паміж нашымі краінамі, дапамагчы знайсці новыя дзелавыя кантакты для літоўскіх і беларускіх прадпрымальнікаў, — сказаў карэспандэнту «Звязды» генеральны дырэктар Канфедэрацыі прадпрымальнікаў і працадаўцаў Літвы Данас Арлаўскас. — Не сакрэт, што пасля візіту беларускага Прэзідэнта ў нашу краіну, калі ў Вільнюсе праходзіў Літоўска-Беларускі эканамічны форум, дзелавыя ўзаемаадносіны паміж прадстаўнікамі бізнэсу Беларусі і Літвы значна актывізаваліся. З абодвух бакоў вырасла зацікаўленасць у сумесных праектах. Нам вельмі прыемна, што нашым асноўным партнёрам у арганізацыі гэтых сустрэч з беларускага боку выступае Мінскі сталічны саюз прадпрымальнікаў і працадаўцаў.

На думку Гандлёвага прадстаўніка Літвы ў Беларусі Эдвінаса Камінскаса, рух у напрамку нашай рэспублікі сёння выбіраюць тыя літоўскія бізнэсмены, якія лічаць выгадным такое міжнароднае супрацоўніцтва. І падобных прадстаўнікоў бізнэсу Літвы нямала. Прыкладам асабліва паспяховага беларуска-літоўскага дзелавога супрацоўніцтва можна назваць узаемадзеянне Шаўляйскага і Панявежскага паветаў з Гомельскай вобласцю, а таксама Вільнюскага павета і Гродзенскай вобласці. Актыўна ўсталёўваюць двухбаковыя кантакты Клайпеда і Магілёў, Шаўляй і Баранавічы. Практычна штодзень у Пасольства Літвы ў Мінску паступаюць запыты ад прадстаўнікоў літоўскага бізнэсу, настроеных як на гандаль, так і на ажыццяўленне інвестыцыйных праектаў у Беларусі. Так, гандлёвая кампанія «Сенукай» плануе будаўніцтва супермаркетаў у беларускіх абласных цэнтрах, перш за ўсё — у Гродне і Магілёве. А прадстаўнікі літоўскага акцыянернага таварыства «VMG» ужо заснавалі ў беларускай свабоднай эканамічнай зоне «Магілёў» прадпрыемства і выбралі ўчастак для будаўніцтва комплексу дрэваапрацоўчых фабрык. Цікава, што «VMG» будзе ўвасабляць праект са сваім партнёрам — лідарам сусветнай мэблевай прамысловасці кампаніяй «IKEA». Гатовыя літоўскія інвестары ўкладваць свае сродкі і ў развіццё Аўгустоўскага канала з беларускага боку.

Вялікія рэзервы беларуска-літоўскага дзелавога супрацоўніцтва хаваюцца сёння ў актывізацыі ўзаемадзеяння структур малога і сярэдняга бізнэсу дзвюх краін, што вельмі наглядна паказала нядаўняя сустрэча прадпрымальнікаў Літвы і Беларусі ў літоўскім пасольстве. Яно і зразумела. Бо ў той жа Літве 95 працэнтаў усіх прадпрыемстваў — гэта малыя і сярэднія фірмы. Аб вялікай увазе літоўскага боку да развіцця кантактаў з беларускімі партнёрамі ў гэтым сегменце эканомікі сведчыць хоць бы той факт, што нядаўна ў Літве была створана Асацыяцыя «Дзелавы савет па эканамічным і гандлёвым супрацоўніцтве з Рэспублікай Беларусь», у якую ўвайшлі прадстаўнікі асноўных галіновых асацыяцый, а таксама малых і сярэдніх прадпрыемстваў, якія маюць вопыт і перспектывы супрацоўніцтва з беларускімі партнёрамі ў гандлёва-эканамічнай і інвестыцыйнай сферы. Існуе ў Літве таксама і Савет прадпрымальніцтва — кансультацыйны орган па пытаннях літоўска-беларускіх эканамічных узаемаадносінаў.

Падчас кантактаў з літоўскімі бізнэсменамі, мне не раз даводзілася чуць думку аб тым, што ў Беларусі апошнім часам адбываюцца вялікія змены і ў паляпшэнні інвестыцыйнага клімату, і ва ўмовах вядзення бізнэсу, і ў іншых важных для дзелавых людзей кірунках эканамічнай дзейнасці. А вось даведваюцца яны пра гэта ўсё неяк пазнавата. Думаецца, што ажыццяўленне літоўскім бокам вышэйзгаданага сумеснага праекта дыпламатаў і прадпрымальнікаў «Перспектывы гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж прадпрымальнікамі Літвы і Беларусі» ўжо становіцца апорнай канструкцыяй беларуска-літоўскага інфармацыйнага моста, яшчэ адным вельмі важным элементам якога, мы спадзяёмся, стане і беларуска-літоўскі інфармацыйна-кааперацыйны праект газеты «Звязда» — «Геаграфія дзелавога супрацоўніцтва: Літва», з першай публікацыяй якога мы знаёмім сёння нашых чытачоў.

**Барыс ЗАЛЕСКІ.**





LITEXPO

**ПЛАН МЕЖДУНАРОДНЫХ ВЫСТАВОК И МЕРОПРИЯТИЙ 2010**

**Февраль**

**4–6 УЧЁБА. СТУДИИ. КАРЬЕРА**
Профессиональное развитие, студии, протяжное обучение взрослых

**18–20 ADPRINT**
Реклама, маркетинг, выставочный дизайн и полиграфия

**18–21 ВИЛЬНЮССКАЯ КНИЖНАЯ ЯРМАРКА**

**26–28 VIVATTUR**
Туризм, спорт и досуг

**Март**

**5–7 ЗОЛУШКА**
Косметика, парфюмерия, оборудование для салонов красоты и парикмахерских, солярии

**25–28 МЕБЕЛЬ**
Мебель разного назначения, новые идеи мебельного дизайна

**25–28 BMTf**
Материалы для мебельной и деревообрабатывающей промышленности

**Апрель**

**14–17 RESTA** ufi
Строительство и ремонт

**27–29 TRANSBALTICA**
Международная выставка и конференция транспорта

**Май**

**7–9 ЛЕТНЯЯ ЯРМАРКА**
Организация досуга и развлечений

**11–13 BALTTECHNIKA**
Научные инновации и высшие технологии Промышленное оборудование и техника, энергия, электротехника. Инженерная кооперация

**11–13 INFOBALT**
Технологии информационного общества

**Сентябрь**

**30 сентября – 2 октября ГОРОД. НЕДВИЖИМОСТЬ**
Проекты развития и модернизации городов, недвижимое имущество, его проектирование, строительство,реализаця ,инвестиции

**Октябрь**

**7–9 BMTtech**
Технологии и оборудование для мебельной и деревообрабатывающей промышленности

**13–16 БАЛТИЙСКИЙ ТЕКСТИЛЬ И КОЖА**
Текстиль и одежда, сырье и инновации

**Ноябрь**

**4–6 BALTSHOP. BALTHOTEL. BALTGASTRO**
Гастрономия, оборудование для магазинов, гостиниц и ресторанов

**4–6 BAF**
Пищевые продукты и напитки

**19–21 СТРАНА ДЕТЕЙ**
Средства по уходу за младенцами, игрушки, игры, мебель для детской комнаты, детская одежда, обувь

**19–21 УМНЫЙ ДОМ**
Представление о "цифровом" доме. Бытовая электроника, техническое оборудование и современные информационные технологии для быта

**19–21 ВАШ ДОМ**
Ярмарка интерьера и быта

**Декабрь**

**3–5 ПРАЗДНИК**
Подарки, подготовка праздников и атрибутика, зимний спорт и развлечения.

**ЗИМНИЙ БУКЕТ**
Выставка и конкурс флористов

Организатор выставок

LITEXPO ufi Member

**Литовский центр выставок и конгрессов ЛИТЭКСПО**
Пр. Лайсвес 5, LT-04215 Вильнюс
Тел. +370 5 245 1800
Факс +370 5 268 6826
Эл. п. info@litexpo.lt

Более подробная информация: **www.litexpo.lt**



**MORE THAN JUST CHEMICALS**

BRENNTAG



**Группа Brenntag**, основанная в 1874 году, является самым крупным в Европе дистрибьютором химического сырья и третим по величине такого типа предприятием в Америке. Фирму Brenntag знают во всех промышленно развитых странах мира. В 1999 году к группе, в которую входит свыше 300 компаний с более чем 11 000 сотрудников по всему миру, присоединились и мы – Brenntag Lietuva. А с приобретением компании Dipol Chemical International Inc., успешно развившей деятельность в странах Балтии, в России, Украине, Белоруссии, Молдове и США, в 2008 Brenntag сделал еще один важный шаг в укреплении дистрибьюторской сети в странах Балтии, Центральной и Восточной Европы.

**Brenntag Lietuva** – является поставщиком (отчасти и производителем) широкого ассортимента специальных и стандартных химических веществ, используемых в различных промышленных отраслях:

- производство пищевых продуктов,
- лаки и краски, строительные материалы,
- косметика и бытовая химия,
- пластмассы и резина,
- производство кормов,
- полиграфия,
- очистка воды,
- металлообработка,
- фармацевтика,
- текстильная промышленность,
- нефть и газ.

**Brenntag Lietuva**, обосновавшись в городе Каунас, в Литве имеет свою инфраструктуру и опытный персонал с химическим образованием. В столице Латвии Риге аналогично свою деятельность развивает Brenntag Latvia. Наша компания поставляет химическое сырье не только на рынок Литвы, но и на соседние рынки Белоруссии и Калининграда. Brenntag Lietuva на Белорусском рынке более активной стало в 2008 году и будет стремится в ближайшие года не уступать позиций, а только их укреплять.

**Мы верим**, что успехи наших клиентов и доверие поставщиков составляют предпосылки благополучия нашей компании. Поэтому мы стараемся создавать свое будущее на основе партнерских отношений с клиентами и поставщиками, поскольку от полноценного сотрудничества выигрывают обе стороны.

**Мы постараемся** завоевать и удержать позицию ведущего дистрибьютора как на Европейском рынке, так и во всем мире, предлагая клиентам лучшее на рынке соотношение цены и качества поставляемых продуктов.

Поскольку **мы осознаем риск** и опасность работы с химическими веществами, мы делаем все необходимое для того, чтобы при транспортировке и хранении химикатов, а также при выполнении других видов операций с ними соблюдались все возможные меры безопасности.

**Мы заботимся** об окружающей среде, потому следим за влиянием нашей деятельности на окружающую среду и делаем все возможное для предотвращения любого вероятного отрицательного воздействия. Мы поддерживаем экологические инициативы и принимаем участие в программах, целью которых является улучшение состояния окружающей среды.

**В нашу** команду входят тщательно отобранные, компетентные, надежные сотрудники, которым предложена стимулирующая система обучения и оплаты труда, а также безопасные условия труда.

**ЗАО Brenntag Lietuva в свою команду примет энергичного и не боящего вызовов сотрудника в Минске.**

**Если вам близка позиция Brenntag Lietuva, мы ждем ваших CV по электронной почте cv@brenntag.lt или по факсу +370 37 760209.**

**ЗАО Brenntag Lietuva**
**ул. Палемоно 171 Д, LT-52107 г. Каунас, Литва**
**Тел. +370 37 759095, Факс +370 37 760209**
**е-почта: info@brenntag.lt, www.brenntag.lt**

